Падтрымай "Вясну" на PATREON

Абвешчаны прысуд Уладзіміру Жыхару, які нібыта адабраў у амапаўца траўматычны пісталет і адвалтузіў яшчэ некалькіх

30.04.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, сілавыя структуры



Уладзімір Жыхар на Маршы герояў 13 верасня.

Суд Савецкага раёна Мінска 30 красавіка вынес прысуд Уладзіміру Жыхару, які нібыта пад час маршу на Дразды выхапіў у супрацоўніка міліцыі траўматычны пісталет "Аса" і нанёс цялесныя пашкоджанні некалькім амапаўцам.

Жыхара абвінавацілі адразу па трох артыкулах Крымінальнага кодэксу:

- частка 1 артыкула 342 КК (арганізацыя або актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак);
- артыкул 364 КК (гвалт альбо пагроза прымянення гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў);
- частка 2 артыкула 206 КК (рабаванне, спалучанае з гвалтам, альбо з пагрозай прымянення такога гвалту).

Справу разглядаў суддзя **Аляксандр Якунчыхін.** Дзяржабвінаваўца - пракурор **Анастасся Маліко.**


Па справе праходзілі восем пацярпелых супрацоўнікаў амапу: **Дзямідаў, Кісялёў, Анатоль Грыбоўскі, Дзмітрый Колчын, Андрэй Назараў, Іван Леснікоў, Сяргей Бурак, і Крукаў.**



Пацярпелыя амапаўцы ў судзе.

Па матэрыялах следства, 13 верасня Жыхар з групай асоб удзельнічаў ў парушэнні грамадскага парадку (парушэнне працы транспарту, перашкаджалі працаваць цырульні “Кот Матроскін”, Фікс-Прайсу, Белфармацыі), тым самым абмежавалі права грамадзян на свабодную працу і адпачынак.

Па дарозе ў Дразды, па Ціхаму завулку каля дома 6, маючы ідэю прымянення гвалту да супрацоўніка амапу Грыбоўскага, схапіў яго і паспрабаваў выцягнуць з аўтамабіля. Пагражаў прымяненнем гвалту камандзіру Бураку, Дзяміду, Кісялёву, Крукаву з мэтай перашкодзіць іх абавязкам. Спрабаваў таксама выхапіць траўматычны пісталет.



"Хочацца верыць, што некалі краіна стане свабоднай". Апошняе слова Уладзіміра Жыхара ў судзе

Але як Жыхар мог заблакаваць усе маршруты? Скажам, тралейбус маршрута 92 “Карастаянава-Чыжоўка” ўвогуле не перасякае шлях руху мітынгоўцаў, а тралейбус №4 па выхадных не ходзіць увогуле.

Пракурор Анастасія Маліко запрасіла для Жыхара пяць год пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Прадстаўнік прадпрыемства “Мінсктранс” прад’явіў Жыхару матэрыяльную шкоду з-за перабояў у працы грамадскага транспарту ў памеры 30 тысяч 1 рубель 82 капейкі.

У сваім апошнім слове Жыхар сказаў, што ў нас адабралі права абараняць сваё жыццё і што хочацца верыць, што некалі краіна стане свабоднай і наш народ будзе жыць на сваёй зямлі.

Суддзя Якунчыхін абвясціў прысуд: прызнаць вінаватым па арт. 342 КК і прызначыць пакаранне тэрмінам тры гады абмежавання волі ў выпраўленчай установе адкрытага тыпу, па арт. 364 КК - чатыры гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму і па арт. 206 КК - два гады калоніі агульнага рэжыму.

У сукупнасці, шляхам частковага накладання, прызначыць канчатковае пакаранне - **пяць год пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.**

Кампенсацыі маральнай шкоды:

Грыбоўскаму – 1 000 рублёў;

Дзямідаву – 1 000 рублёў;

Кісялёву – 1 000 рублёў;

Крукаву – 1 000 рублёў;

Бураку – 1 000 рублёў;


Леснікаву – 3 000 рублёў;


Колчыну – 1 000 рублёў.

Таксама суд прызнаў права “Мінсктранса” аб спагнанні з Жыхара матэрыяльнай шкоды ў памеры 30 тысяч 1 рубель 82 капейкі ў грамадзянскім працэсе.

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

